# Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам XXVI Міжнароднага форуму «ТІБО-2019»

8 красавіка ў г. Мінску ўрачыста адкрыты XXVI Міжнародны форум па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБО-2019».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам XXVI Міжнароднага форуму па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях "ТІБО-2019»:

«Вітаю ўдзельнікаў і гасцей Міжнароднага форуму «ТІБО-2019».

Дзякуючы гэтым штогадовым сустрэчам Мінск стаў адной з самых значных пляцовак ва Усходняй Еўропе для прэзентацыі найноўшых дасягненняў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Дзесяткі кампаній з розных краін менавіта тут прадстаўляюць прагрэсіўныя распрацоўкі ў галіне штучнага інтэлекту, інтэрнэту, хмарных тэхналогій, дапоўненай рэальнасці, мабільнай сувязі.

Беларусь зрабіла стаўку на лічбавізацыю сваёй эканомікі, што дазволіла ёй стаць «лічбавым мастом» паміж краінамі ЕС, Еўразійскага эканамічнага саюза і Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну. Айчынны Парк высокіх тэхналогій пастаянна прырастае новымі рэзідэнтамі, а моладзь усё часцей звязвае сваю будучыню з ІТ-сферай.

Перакананы, абмен перадавым вопытам на цяперашнім форуме "ТІБО-2019» будзе садзейнічаць развіццю інавацыйных тэхналогій у нашай краіне і за яе межамі.

Жадаю вам прафесійных поспехаў, перспектыўных праектаў і прыемных уражанняў ад гасціннага Мінска».

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/09-04-2019-4399*